Эти условия апробированы нами в курсе педагогических дисциплин, которые дают возможность воздействовать на сознание обучающихся, формировать опыт межнационального общения, стимулировать эмоционально-ценностное отношение к представителям любой национальности, вырабатывать умения сосуществовать в межнациональном и межкультурном взаимодействии. Одним из условий является включение обучающихся в межнациональное общение. Если эта деятельность будет носить «регулярный и содержательный характер…», то она, по мнению академика И. Ф. Харламова, будет способствовать «развитию и упрочению убеждений и выработке многостороннего опыта поведения, связанного с проявлением и совершенствованием этих важнейших моральных качеств», в том числе и толерантности [1, с. 399].

Таким образом, данный комплекс условий будет способствовать воспитанию человека культуры другого уровня в межнациональном и межкультурном взаимодействии.

**Список использованных источников**

1 Харламов, И. Ф. Педагогика : учебник / И. Ф. Харламов. – 7-е изд. – Минск : Университетское, 2002. – 560 с.

**М. У. Буракова, А. М. Жукоўскі**
**г. Гомель, ГДТУ імя П. В. Сухога**

## АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ ВЫХАВАННЯ ТАЛЕРАНТНАСЦІ

Беларусы заўсёды вызначаліся талерантнасцю ў адносінах да людзей розных нацыянальнасцей, розных веравызнанняў, на Беларусі мірна суіснавалі хрысціяне, каталікі, іудзеі, мусульмане і інш. Аднак з уплывам падзей у свеце адной з актуальных праблем сучаснага выхавання моладзі стала праблема цярпімых адносін да людзей іншых нацыянальнасцей, іх культуры і традыцый. На жаль, усё больш распаўсюджваецца сярод моладзі нядобразычлівасць, узлаванасць, агрэсіўнасць, нецярпімасць і культурны эгаізм. Таму асабліва важна і неабходна актывізаваць працэс пошуку эфектыўных механізмаў выхавання талерантнасці ў сучаснай моладзі, тым больш у студэнцкім асяроддзі.

Выкарыстанне тэрміна «талерантнасць» у апошняе дзесяцігоддзе мае шырокае распаўсюджанне. Цікава, што даны тэрмін мае медыцынскае паходжанне (уведзены ў 1953 г. імунолагам П. Медаварам)

і абазначае неўспрымальнасць арганіма да антыгену. У сацыяльнай сферы талерантнасць (ад лац. *tolerantia* – цярпенне, цярпімасць да чужога вобраза жыцця, паводзінаў, звычаяў, пачуццяў, поглядаў, ідэяў, вераванняў) – гэта павага, прыняцце і правільнае разуменне багатай разнастайнасці культуры нашага свету, нашых формаў самавыражэння і спосабаў праяўлення чалавечай індывідуальнасці. Само слова *талерантнасць* тлумачыцца на розных мовах амаль аднолькава, а вось самым блізкім па значэнні словам, так званым сінонімам, выступае лексема *цярпімасць*. Па ініцыятыве ЮНЭСКА 1995 год быў абвешчаны годам талерантнасці, а 16 лістапада кожнага года – Міжнародным днём талерантнасці [1, с. 36].

Умовай нармальнага функцыянавання грамадзянскага (цывільнага) соцыуму і ўмовай выжывання чалавецтва з'яўляецца талерантнасць. Яна стала адной з маральных асноў сусветнага згуртавання, а таксама павышэння якасці адукацыі. Для правядзення мэтанакіраванай работы па выхаванні талерантнасці і стварэнні міжкультурнага дыялогу ў студэнцкай моладзі ў Гомельскім дзяржаўным тэхнічным універсітэце імя П. В. Сухога 12 лістапада 2012 года быў створаны інтэрнацыянальны клуб «Дружба». Членамі клуба з'яўляюцца замежныя і беларускія студэнты. Зараз ва ўніверсітэце вучыцца 150 замежных студэнтаў з Туркменістана (іх большасць), Расіі, Украіны, Шры-Ланкі, Кітая, Егіпта, Ізраіля, Казахстана і Сірыі. Адаптацыя і стварэнне ўмоў пражывання ў Рэспубліцы Беларусь для замежных студэнтаў, выхаванне павагі да нацыянальных традыцый розных народаў, наладжванне міжкультурных зносін – гэта не поўны пералік задач, якія стаяць перад членамі клуба «Дружба».

Асаблівая роля ў фарміраванні талерантнасці ў моладзі, безумоўна, належыць педагогам. Паспяховасць рашэння праблемы выхавання залежыць ад таго, як у дзейнасці педагогаў рэалізуюцца асноўныя прынцыпы талерантнасці. Да іх адносяцца:

– *прынцып суб'ектыўнасці:* апора на актыўнасць студэнта, ініцыятыўнасць, стымуляванне яго самавыхавання, свядомых паводзін і самакарэкцыі ў адносінах з іншымі людзьмі;

– *прынцып адэкватнасці:* адпаведнасць зместу і сродкаў выхавання сацыяльнай сітуацыі, у якой арганізуецца выхаваўчы працэс; улік разнастайных фактараў сацыяльнага асяроддзя (нацыянальных, рэлігійных, сямейных і інш.);

– *прынцып індывідуалізацыі:* улік індывідуальных адметнасцей і ўзроўня сфарміраванасці талерантнасці ў навучэнца; раскрыццё патэнцыялу пэўнай асобы як у вучэбнай, так і ў пазавучэбнай дзейнасці;

прадстаўленне магчымасцей кожнаму студэнту для самарэалізацыі і самараскрыцця;

– *прынцып рэфлексіўнай пазіцыі:* арыентацыя на фарміраванне ў студэнтаў свядомай устойлівай сістэмы адносін да якой-небудзь значнай для іх праблемы, якія праяўляюцца ў адпаведных паводзінах і ўчынках;

– *прынцып стварэння талерантнага асяроддзя:* фарміраванне ва ўніверсітэце гуманістычных адносін; выхаванне ў студэнтаў і выкладчыкаў пачуцця ўзаемнай адказнасці; дамінаванне творчага пачатку пры арганізацыі вучэбнай і пазавучэбнай дзейнасці.

Даныя прынцыпы з'яўляюцца тым падмуркам, на якім заснавана дзейнасць клуба «Дружба». У ім дзейнічае самакіраванне, добраахвотны ўваход і раўнапраўе яго членаў. Работа клуба праводзіцца ў адпаведнасці з праграмай мерапрыемстваў па выхаваўчай рабоце: тэматычныя вечары, конкурсы, спартыўныя спаборніцтвы, секцыі мастацкай самадзейнасці, народных традыцый і інш. Клуб «Дружба» цесна супрацоўнічае з універсітэцкай газетай «Сушка», якая дае магчымасць пазнаёміць не толькі членаў клуба, але і ўсіх студэнтаў універсітэта з культуралагічнай інфармацыяй замежных студэнтаў.

Вялікая ўвага надаецца патрыятычнаму выхаванню студэнтаў: сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, удзел у парадах, конкурсы ваенна-патрыятычнай песні «Па старонках памяці». Вельмі прыемна бачыць, як раскрываецца творчы патэнцыял студэнтаў у клубе, асабліва калі ідзе падрыхтоўка да музычных конкурсаў і фестываляў. Напрыклад, лязгінка туркменскіх студэнтаў так паўплывала сваёй энергічнасцю на беларускіх студэнтаў, што яны навучыліся танцаваць не горш і пасля сталі выступаць разам з туркменскімі студэнтамі. Нельга не адзначыць і кулінарныя конкурсы, якія не толькі знаёмілі з адметнасцямі кухні розных народаў, але і спрыялі аб'яднанню ўдзельнікаў клуба ў адзіны калектыў, далі штуршок да разнастайнай тэматыкі заняткаў па этнакультуралогіі розных краін і народаў, прадстаўнікамі якіх з'яўляюцца студэнты клуба. Толькі пры актыўным удзеле кожнага члена калектыву ў працэсе выхавання магчымы сапраўдная самадзейнасць, творчасць, ініцыятыва.

У план дзейнасці інтэрнацыянальнага клуба «Дружба» ўваходзяць наступныя мерапрыемствы:

– інфармацыйная і кансультатыўная падтрымка замежных студэнтаў;

– прафілактыка правапарушэнняў з боку замежных студэнтаў, у тым ліку правіл унутранага распарадку ў інтэрнатах;

– арганізацыя і правядзенне культурных мерапрыемстваў, удзел у канцэртах, семінарах, трэнінгах, спартыўных спаборніцтвах;

– удзел у фестывалях творчасці замежных студэнтаў;

– аказанне дапамогі замежным студэнтам, якія вучацца ва ўніверсітэце, у вывучэнні рускай і беларускай моў і культуры нашай краіны;

– дапамога ў рэалізацыі ідэй і праектаў студэнтаў, накіраваных на аптымізацыю адукацыйнага і выхаваўчага працэсаў;

– арганізацыя сустрэч з вядомымі і аўтарытэтнымі дзеячамі культуры, навукі, спорту і іншых сфер;

– супрацоўніцтва з іншымі моладзевымі аб'яднаннямі вышэйшых навучальных устаноў г. Гомеля і іншых гарадоў Беларусі;

– арганізацыя экскурсій па гарадах Беларусі.

Інтэрнацыянальны дух клуба становіцца рухаючай сілай калектыву толькі пры адзінстве, гарманічным зліцці дзейнасці, думкі, пачуццяў і перажыванняў усіх членаў калектыву. Гэта адзінства – «першакрыніца і найважнейшы стымул фарміравання трывалых ідэйных перакананняў калектыву і кожнай асобы» [2, с. 55]. Калектыў клуба вырашае задачу не часовай занятасці і зацікаўленасці замежных і беларускіх студэнтаў, а выпрацоўкі высокіх маральных якасцей, якія будуць уласцівы кожнаму студэнту не толькі сёння, заўтра, але і заўсёды. Кожны студэнт павінен усвядоміць, што ляжыць у аснове чалавечых зносін, якія духоўныя багацці набывае чалавек у калектыве.

Калектыў становіцца выхаваўчай сілай толькі ў тым выпадку, калі ён як арганізацыйнае, ідэйнае, маральнае адзінства натхнёны духоўным багаццем, інтэлектуальнай шматграннасцю і жыцейскай мудрасцю. Агульнае задавальненне духоўных патрэб, узаемнае абагачэнне і пастаянная перадача духоўных багаццяў – вось рысы сапраўднага калектыву. Студэнцкае жыццё павінна быць такім, каб у ім заўсёды дзейнічала сістэма адказнасці чалавека за чалавека, адказнасці чалавека перад грамадствам. Чалавек – калектыў – грамадства – вось тая сістэма ўзаемаадносін, дзякуючы якой калектыў становіцца сілай, якая выхоўвае актыўных, талерантных людзей, што будуць чулымі да грамадзянскіх і грамадскіх праблем.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1 Семина, Л. И. Учимся диалогу. Толерантность: объединения и усилия / Л. И. Семина // Семья и школа. – 2001. – № 11–12. – С. 36–40.

2 Кваша, Б. Ф. Воспитательная система В. А. Сухомлинского: посвящается 80-летию со дня рождения / Б. Ф. Кваша. – К., СПб. : АПН Украины, ПАНИ, 1999. – 240 с.